# [Двор Сівайчавых]

Вёска ............ расьселася на ўзгорку, нібы для супачынку ад вялікай падарожжы. Навокал рась[сь]цілаліся коўдры зялёных паплавоў, а на іх бурлілася кольцам няшырокая, але заўсёды нездаволеная сама сабою рэчка. Наводдалі віднелася йстужка смуглага лесу, што апяразвала сабою сялянскія нівы. А ўгары — з пераменнымі колерамі неба, падобнае на абернуты на землю коўш.

Пад каўшом вёска. Яна нібы ў палоне, як муха пад сіняю шклянкаю. Скуль і куды яна йдзе, хіба песьня яе засмучаная адкажа. Толькі яна адчувае сябе часова пад шклянкаю. У беспарадку раскінула вёска да часу свае пасінеўшыя хаты, панакрывала іх непразрыстымі, хоць і цёплымі, шапкамі стрэх і паабгароджвала іх частаколамі ўласнасьці. І сама рассыпалася (падзялілася) на асобныя агароды, па–рознаму на кожным абярнулася ў вобраз чалавека.

З краю ўзгорка абшарпаны двор Сівайчавых. Доўга і даўно ўжо ён абабраў сабе гэта ня зусім выгаднае месца. Якраз ля крыжавых дарог. Усякі, хто едзе, — а езьдзіць шмат людзей, — шарганецца аб рог агароду Сівайчавых. Мо' наўмысьля, мо' не: праезд быў з даўных–даўна вузкі. Толькі хата ўжо ледзьве стаяла на нагах. Зусім асунулася старая, і каб ня хлеў да гуменца, што выглядалі яшчэ малажавымі і трымалі пад рукі хату, яна–б мо' ўжо даўно і паваліліся. Пад вачамі вокан яе панапухалі сінякі. Мо' ад сьлёз, а мо' ад кулакоў — трудна згадаць. Яна ціха толькі стагнала, і праз бяззубыя вусны дзьвярэй глуха час ад часу вырываўся ні то ёнк, ні то жальба–скарга.

За Сівайчавымі, нібы за яе сьпінамі, сядзелі другія двары. Ды былі й там усялякія. Адны гардыя ў жоўтых кофтачках новых хат з моцнымі локцямі, што заўсёды штурхаюцца, каб сабе шырэйшае месца заняць, каб прастарней і вальней расьсесьціся за банкетным сталом жыцьця. Другія мо' ад цеснаты, мо' ад свае слабасьці пасьціскаліся ў судачках ды пячурках з памятымі вопраткамі, а то й бакамі. Ёсьць і трэйція, і чацьвёртыя, і дзясятыя... Шмат двароў у вёсцы ............

На кожным — людзі. Усялякага ўзросту: старыя, сярэднія, малыя... Імі і вёска спачывае на ўзгорку. Аднімі ад маткі дзяцей, і яна ўжо ня матка. Так і вёска. Зьбяруцца калі ў адну кучу — на сход, гаворку сваю простую ўзьнімуць — і вёска ў гомане ўзьнімаецца з свайго месца, каб далей ісьці. А разыдуцца па хатах — і вёскі няма. Ёсьць Тодаравых, Карчомных, Тарасавых, Барахоўскіх... Ёсьць Мікіта, Ануфрай, Дзям'ян, Іван, Пятрусь... Ёсьць Алена, Тадора, Настуля, Параска... Ёсьць Юзік, Грышка, Волька, Зоська... А вёскі й няма. Мо' таму няма, што яна ў кожнага за каўняром, а мо' таму, што яна толькі на ўзгорку...

— Трэба, трэба і трэба, — скрыгацяць гукі трэскатам апошніх трэсак, ускінутых на вогнішча перад выпраўленьнем у дарогу. А разыдуцца гукі па дварох і ўжо іначшым ладам тут брашчаць. У загародках іначай гукі тыя хвалююцца — б'юцца ў цесных клетках аб берагі жыцьця.

Для Сівайчавых „трэба“ азначала „хочуць“, і штосьці страшнае вісела над іх двaром. І баяўся стары Ануфрай, каб яно не звалілася і *[працяг рукапісу страчаны]*

*[1925]*